− **Проектная деятельность.** Разработка исследовательских проектов, в которых учащиеся анализируют историко-культурный контекст романа, сравнивают его с современными реалиями или создают визуальные карты персонажей и их взаимодействий.

Таким образом, проблемное изучение романа «Евгений Онегин» представляет собой эффективный метод глубокого и всестороннего осмысления сложных вопросов, заложенных в произведении. Применяя проблемное обучение, педагог не только помогает учащимся проникнуть в авторский замысел и образы пушкинского мира, но и формирует навыки критического мышления, творческой интерпретации и самостоятельного аналитического поиска.

Список использованной литературы

1. Маранцман, В. Г. Изучение творчества А. С. Пушкина в школе: на пути к А. С. Пушкину : пособие для учит. и учащ. : в 2-х ч. / В. Г. Маранцман. – М. : ВЛАДОС, 1999. – 256 с.

## ІДЭНТЫЧНАСЦЬ НАРАТАРА І ГЕРОЯ Ў ЗБОРНІКУ Ф. БАГУШЭВІЧА «ДУДКА БЕЛАРУСКАЯ»

**Еўтуховіч Елізавета (УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, г. Мазыр)**
**Навуковы кіраўнік – П.Р. Кошман, канд. філал. навук, дацэнт**

У беларускай гісторыі пачатак нацыянальнага мастацтва слова трывала атаясамліваецца са зборнікам «Дудка беларуская» Ф. Багушэвіча. Даследчыкі адзначаюць насычанасць зместу прадмовы да зборніка асноватворнымі ідэямі беларускага адраджэння [1], а значэнне паэтычнай часткі тлумачыцца тым, што яна «культывавала сярод беларускіх пісьменнікаў пачуццё грамадскай адказнасці асобы перад народам і радзімай» [2, с. 23].

Прадстаўленая ў зборніку «Дудка беларуская» карціна свету беларуса служыць важным матэрыялам для даследавання праблемы фарміравання і рэпрэзентацыі беларускай ідэнтычнасці. Відавочна, што кніга з’яўляецца важным мастацкім дакументам канца XIX ст., у якім адбіліся погляды тагачаснай творчай інтэлігенцыі Беларусі і найперш самога Ф. Багушэвіча на сваё прызначэнне і на беларускі народ.

У зборніку «Дудка беларуская» вобраз наратара прадмовы і вершаў звязаны з аўтарскім светапоглядам, але не супадае з ім. Ф. Багушэвіч дае слова простым працавітым людзям, якія выяўляюць калектыўную

свядомасць беларускага народа. Яны выступаюць ад імя прыгнечанага сялянства, разважаючы пра маральныя каштоўнасці, а таксама цяжкасці і нягоды свайго часу. Тэксты зборніка характарызуюцца спробай нівеліраваць існуючую сацыяльную дыстанцыю паміж аўтарам як прадстаўніком грамадскай эліты і беларускім сялянствам, якое на той час уяўляла аснову беларускага этнасу. Жадаючы быць прызнаным беларускім селянінам, несучы для яго ідэю кнігі «аб жыцці нашым, каб па-нашаму» [3, с. 113], Ф. Багушэвіч выбірае наратарам і галоўным героем сваіх твораў менавіта чалавека з народа. Яго Мацей Бурачок прадстаўляе сябе звычайным беларускім мужыком, які вырашыў са сваімі братамі «пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі» [3, с. 112]. Размова падымае праблемы, якія знаходзяцца па-за межамі паўсядзённых клопатаў беларускага вяскоўца, але маюць вызначальны ўплыў на яго грамадскае быццё.

Уздымаючы тэмы беларускай мовы, гісторыі і, урэшце, самой Беларусі, Мацей Бурачок імкнецца разварушыць свядомасць сваіх суайчыннікаў, дапамагчы ім усвядоміць значнасць сваёй культуры, яе роўнасць з набыткамі іншых народаў. Яго прамова, спалучаючы асабістыя перажыванні і гістарычныя факты, набывае неабходны рэзананс і глыбіню. Мацей Бурачок згадвае ўласны досвед адносін да беларускай мовы, называючы яе калісьці «мужыцкай», але потым усвядоміўшы яе каштоўнасць як «панскай і людской». Гэты ход умацоўвае сувязь з чытачамі, якія могуць мець падобныя сумневы.

Аўтар карыстаецца багатай колькасцю стылістычных прыёмаў, якія ўзмацняюць эмацыянальны эфект прадмовы. Напрыклад, рытарычнае пытанне «Што ж мы за такія бяздольныя?» [3, с. 112] прымушае чытача разважаць над сітуацыяй і задумвацца аб каштоўнасцях, параўнанне з «французскай» ці «нямецкай» паказвае беларускую мову роўнай з іншымі, а фраза «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!» [3, с. 112] канцэнтруе адзін з важнейшых пастулатаў беларускай ідэі.

Мацей Бурачок, ад імя якога прамаўляюцца ў прадмове важныя для беларускай ідэнтычнасці словы, і герояў вершаў яднае адзіны жыццёвы вопыт і прыналежнасць да беларускай народнай культуры. Разам з тым прамоўца дэманструе той высокі ўзровень самасвядомасці, да якога героям вершаў і іх чытачам яшчэ трэба было прайсці пэўны шлях. Уласныя крокі ў гэтым кірунку аўтар прадмовы пазначае фразамі «паздароў Божа добрых людцоў, як навучылі мяне чытаць-пісаць, з той пары я шмат гдзе быў, шмат чаго відзеў і чытаў» [3, 112]. У сваю чаргу галоўныя героі вершаў «Дудкі беларускай» раскрываюцца ў непасрэднай сувязі з прасторай вясковага жыцця. Паказальна у гэтым плане тлумачыць сваю асобу герой верша «Хрэсьбіны Мацюка»:

Тутэйшы, – кажу я, – свой чалавек:
Сын бацькі свайго, а бацька дзяцей,
Тут і радзіўся, тут жыву век;
Юркам звець бацьку, я дык Мацей.
Вун гдзе і хата, і выган, і сад;
Там жнець мая жонка, а тут гарэць брат!.. [3, с. 135].

Аднолькавае імя аўтара прадмовы і героя прыведзенага верша даюць падставы лічыць іх адной асобай. Беларуская і тутэйшай ідэнтычнасць, якая розніць наратара прадмовы і верша, выглядае пацвярджэннем светапогляднай эвалюцыі Бурачка, а ў агульнай канцэпцыі зборніка – ідэі ўсведамлення беларусамі праз асвету сваёй самабытнасці.

Такім чынам, у зборніку «Дудка беларуская» пытанне ідэнтычнасці беларускага народа падаецца ў эвалюцыі. У вершах Ф. Багушэвіча жыццё беларуса-селяніна паказваецца як трывалая этнакультурная аснова адчування ім сваёй самабытнасці, а ў аповедзе Мацея Бурачка дэкларуюцца светапоглядныя прынцыпы беларускага нацыянальнага самаўсведамлення.

*Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па дагаворы № 1410/2021.*

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Беларуская літаратура: Вучэб. дапам. для 10-га кл. агульнадукац. шк. з профільным і паглыбленым вывучэннем бел. літаратуры, ліцэяў, гімназій / В.П.Рагойша [і інш.]; пад рэд. В.П.Рагойшы. – Мінск : Народная асвета, 2001. – 574 с.
2. Гніламёдаў, У. Ад даўніны да сучаснасці: Нарыс пра беларускую паэзію / У.Гніламёдаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2001. – 246 с.
3. Літаратура другой паловы XIX стагоддзя : у 2 ч. / уклад. Л. Г. Кісялёвай, Н. М. Сенкевіч; камент. Л. Г. Кісялёвай; навук. рэд. С. Л. Гаранін. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2013.– Ч. 2 – 807 с.

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ИГРЫ НА УРОКАХ РУССКОГО ЯЗЫКА

**Загорская Вероника (УО МГПУ им. И.П. Шамякина, г. Мозырь)**
**Научный руководитель – С.Б. Кураш, д-р филол. наук, доцент**

В современной школе особое место занимают формы занятий, обеспечивающие активное участие каждого ученика, повышающие авторитет знаний и индивидуальную ответственность. Эти задачи успешно решаются при помощи использования игровых технологий в процессе обучения. В методике преподавания русского языка актуальность проблемы